бел. нар. песні, што ўзмацняла фальклорнапаэт. і эпічнае гучанне пастановак. Сярод роляў нац. рэпертуару: Ганна («На дарозе жыцця» паводле Я.Коласа), Бажашуткава («Амністыя» М.Матукоўскага), Зоя Антонаўна («Блытаныя сцежкі» К.Крапівы). З інш. роляў: Салдатка («Адпачынак пасля ранення» паводле В.Кандрацьева), Атуева («Вяселле Крачынскага» А.Сухаво-Кабыліна), Харыціна («Не страляйце ў белых лебедзяў» паводле Б.Васільева), Ганна Андрэеўна Іхменнева («Прыніжаныя і зняважаныя» паводле Ф.Дастаеўскага), Кручыніна («Без віны вінаватыя» А.Астроўскага). М. адчувае хараство нар. мовы. У спектаклі Тэатра-студыі кінаакцёра (працавала ў 1987—93) «Дзіця з Віфлеема» ўвасабляла на сцэне выканаўцу бел. нар. песень, чытальніка-вядучага і абагульнены вобраз бел. сялянкі, гарманічна спалучала выкананне каляндарна-абрадавых песень з драматызаваным фальклорна-біблейскім апавяданнем. З 1994 працуе ў Рэсп. т-ры бел. драматургіі. Сярод лепшых роляў: Бежанка («Галава» І.Сідарука), гангстэр Эмануэле Гіры («Узлёт Артура Уі, які можна было спыніць» Б.Брэхта); Ведзьма, герцагіня Ёрская («Макбет», «Рычард III» паводле У.Шэкспіра), стварыла яркія нар. персанажы: Магрэта («Паваліўся нехта» паводле Л.Родзевіча, У.Галубка), Маці («Брат мой Сымон» У.Рудава). У спектаклі «Жанчыны Бергмана» М.Рудкоўскага віртуозна, з трагедыйным гучаннем выканала ролю спявачкі Інгрыд, страціўшай голас.

*Літ.:* Лысенка З. Да духоўных вытокаў // Тэатр. Беларусь. 1993. № 2.

**МАРЦІНКЕ́ВІЧ** (па мужу Асіповіч) Каміла Вінцэнтаўна (1837?, Мінск? — пасля 1890), піяністка, кампазітар, педагог. Дачка В.*Дуніна-Марцінкевіча*. Ігры на фп. вучылася ў Мінскім пансіёне Мантэграндзі. З 1847 канцэртавала ў Мінску, Слуцку, Кіеве (1849, 1851), Варшаве (1850), у т.л. з братам Міраславам. Выконвала творы І.Гумеля, Ф.Ліста, Ф.Шапэна і ўласныя, у т.л. варыяцыі на тэму песні А.Варламава «Чырвоны сарафан», фантазію «У летуценні мінулага». Удзельнічала ў спектаклях *Дуніна-Марцінкевіча тэатра*, у т.л. ў «Сялянцы» (1852). Выкладала музыку ў прыватных пансіёнах. На пач. 1860-х гадоў арганізавала ў Мінску і мяст. Гарадок на Маладзечаншчыне школы для дзяцей беднаты. За ўдзел у дэмакр. руху праследавалася царскімі ўладамі, у 1861 арыштавана, у 1863 саслана пад строгі нагляд паліцыі ў г. Салікамск Пермскай вобл. У 1880-я гады вярнулася на радзіму.

*Літ.:* Ахвердава А. Пачынальнікі беларускага піянізму // Мастацтва Беларусі. 1985. № 2; Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. Мн., 1963. С. 148—174; Барышев Г. Из истории семьи В.И.Дунина-Марцинкевича // Неман. 1961. № 1.

*В.П.Пракапцова.*





*Т.**Мархель** у спектаклі «Дзіця з Віфлеема» (уверсе) і ў ролі Маці.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ